# ВЫДРА БЕЛАРУСКАЯ

Выданьне Рады Беларускай суполкі у Чэхіі «Скарына»

N2, сакавік 2005


## У НУМАРЫ


Іна Паўловіч
Як сьвяткавалі Дзень Волі ў Празе 1

Іна Паўловіч
Чэскі пэрыяд Рады БНР 2

Мэчыслаў Грыб
Мы зрабілі памылку 3

Сьвятаслаў Ліпень
Са сьвятам Вялікадня 4


Вечарам 19 красавіка 2005,
на выгнаньні, у Швайцарыі,

**трагічна загінуў**

сябра нашае рэдакцыі й
рэдакцыі газэты «НАВІНКІ»,
адвакат, праваахоўнік, бацька
дзьвух дзяцей й проста
наш добры сябра

**АРСЕНІЙ СКАРУЛІС**

Яшчэ поўгадзіны перад
бязьлітаснаю сьмерцю сьпяваў
Арсеній беларускія песьні.
Хацеў перад сьвятам Дню Волі
узьняць бела-чырвона-белы
сьцяг свабоды над вольнымі
швайцарскімі Альпамі.
Але камяні чужой зямлі ня
ўтрымаліся пад нагой Беларуса.
Беларуса з вялікай літары.
Вечная памяць табе,
дарагі Арсеній.

Наступны нумар
ВЫДРЫ БЕЛАРУСКАЙ
будзе прысьвечаны жыццю й
творчасьці Арсенія Скаруліса

ГІСТОРЫЯ

# ЯК СЬВЯТКАВАЛІ ДЗЕНЬ ВОЛІ Ў ПРАЗЕ

Сьвяткаваньне Дня Волі ў Празе мае даўнюю традыцыю – з пачатку 20-х гг. – тае пары, як на тэрыторыі былой Чэхаславакіі апынулася Рада Беларускай Народнай Рэспублікі (1923) на чале з П.Крэчэўскім. У імпрэзах удзельнічалі тады і шматлікія студэнты з этнічна беларускай часткі Латвіі й Заходняй Беларусі, якія знаходзіліся ў Чэхіі дзякуючы дапамозе чэскіх уладаў з прычыны таго, што ў акупаванай палякамі Заходняй Беларусі не мелі магчымасьці атрымліваць нацыянальную вышэйшую адукацыю.

Так, сьвяткаваньне 25 сакавіка 1923 г. пачалося ў студэнцкім доме ў Празе, дзе чытаўся рэферат аб акце 25 сакавіка й з вялікім посьпехам выступіў беларускі студэнцкі хор. Затым у «Obecnym Dome» адбыўся беларускі канцэрт для чэскай публікі, сарганізаваны прафесарам унівэрсітэта Аўгенам Ляцкім у супрацоўніцтве з чэскімі ўладамі й Радай БНР. З прамовай выступіў таксама й старшыня Рады БНР Пётра Крэчэўскі.

Сьведка тых падзей, які пазьней стаў старшынёй Рады БНР, Вінцэнт Жук-Грышкевіч пісаў: «Сьвяткаваньне 25-га Сакавіка ў Празе нарабіла многа гоману й сярод эміграцыйных кругоў і сярод чэхаў. Найбольш ударыла яно па расейцах, якія нічога ня ведалі аб беларускім вызвольным руху. Яны пачалі кампанію супраць беларускіх сэпаратыстаў. Неўзабаве сярод іх паўстала «Общество белоруссов и малороссов», якое паставіла сабе за мэту змаганьне з беларускім і ўкраінскім сэпаратызмам.

Як бачым, сьвяткаваньнем нацыянальнага сьвята, калі яно адпаведна зарганізавана, мы можам дасягнуць ня толькі сваю прыемнасьць, але й робім вялікую прапагандную беларускую работу».

Традыцыю сьвяткаваньня 25 сакавіка ў Празе пераняла напрыканцы 90-х гадоў мінулага стагоддзя беларуская суполка «Скарына».

Першае сьвяткаваньне адбылося ў 1997 г. У той год сябры новарэгістраванай суполкі правялі акцыю пратэсту на Вацлаўскай плошчы супраць дыктатуры А.Лукашэнкі. Удзельнікі акцыі, імкнучыся прыцягнуць увагу грамадскасьці да парушэньня правоў чалавека ў Беларусі, раздалі некалькі соцен улётак на чэскай й ангельскай мовах.

У апошнія гады ўрачыстае адзначэньне ўгодкаў абвешчаньня БНР традыцыйна праводзілася ў Нацыянальнай Бібліятэцы ў Празе ў Люстраной Залі. Тым беларусам, што прысутнічалі на сьвяткаваньні, шанцавала штогод вітаць дзейсную старшыню Рады БНР Івонку Сурвіллу, якая прыяжджала дзеля сьвяткаваньня ў Чэхію з Канады. Па запрашэньню суполкі ў якасьці ганаровых гасьцей у сьвяткаваньнях прымалі ўдзел: выдатны пісьменьнік Беларусі (сьветлая яму памяць) Васіль Быкаў, старшыня КХП БНФ Зянон Пазьняк, прэзыдэнт ЗБС «Бацькаўшчына» Радзім Гарэцкі, паэты Рыгор Барадулін і Славамір Адамовіч, старшыня Віленскага Таварыства Беларускай Культуры Хведар Нюнька (2004), Мікола Статкевіч ды іншыя. Насычанай заўсёды была й мастацкая частка: гучалі песьні ў выкананьні беларускіх бардаў Сяржука Сокалава-Воюша, Андрэя Мельнікава, Віктара Шалкевіча, Алеся й Касі Камоцкіх.

Адзначэньне ўгодкаў заўсёды праводзілася ў цесным супрацоўніцтве з чэскімі дзяржаўнымі, й грамадскімі арганізацыямі. Так, у мінулым годзе, на сьвяткаваньні прысутнічаў чэскі сэнатар Ян Румл. Па ініцыятыве апошняга (ў супрацоўніцтве з арганізацыяй «Чалавек у нядолі») была склікана напярэдадні Сьвята канферэнцыя ў будынку Чэскага Сэнату «Беларусь – наш бліжэйшы сусед», на якую былі запрошаны й сябры нашае суполкі. Частымі гасьцямі на імпрэзах былі чэскія прадстаўнікі недзяржаўных арганізацыяў: «Чалавек у нядолі», «Арганізацыя дапамогі ўцекачам»



Напярэдадні Сьвята выказваем спадзяваньне, што зноўку адзначым яго ганарова, адзначым яго разам. І некалі (дай Божа каб хутчэй) – разам – у нашай Вольнай Беларусі.

*Іна Паўловіч,*
*старшыня суполкі «Скарына»*

# «ЧЭСКІ ПЭРЫЯД» РАДЫ БНР

"Нічога, мы яшчэ будзем мець аказію прамовіць іншым разам", -- быццам бы так разьвітаўся са Старшынёй Рады БНР Васілём Захаркай ў час яго пахаваньня на Альшанскіх могілках у акупаванай немцамі Празе украінскі прафэсар Мазепа ў сакавіку 1943г. Гэстапа забараніла на гэтым пахаваньні ўсялякія прамовы…

Невядома, ці выкарыстаў акзію пасьля вызваленьня Прагі ад немцаў паважаны прафэсар, але ў беларусаў, што жывуць у Чэхіі, выказаць публічна словы падзякі над магіламі ажно дзьвух Старшыняў Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ёсьць шанец, па меньшай меры, двойчы за год. Першы – гэта адзначэньне ўгодкаў абвешчаньня БНР, калі зьбіраюцца сябры суполкі «Скарына» і яе госьці, ды пасьля Акадэміі ідуць на могілкі, каб ушанаваць памяць Беларусаў, якія сталіся сымбалем нашай незалежнасьці.

Абодзьва пахаваныя недалёка ад праваслаўнай капліцы, пабудаванай у гонар Усьпення Багародзіцы. Пятро Крэчэўскі – з правага боку, Васіль Захарка – амаль на той жа адлегласьці ад капліцы злева.

Пры жыцьці лёс цесна зьвязаў гэтых людзей – яны і паходзілі абодва з сучаснай Гарадзеншчыны. П.Крэчэўскі нарадзіўся у в.Дубна, што каля Мастоў, а В.Захарка – у в.Дабрасельцы пад Зэльвай. Абодва ўдзельнічалі ва Ўсебеларускім З'ездзе ў 1917 г., потым у лютым – сакавіку 1918 г. – у абвешчаньні БНР і яе незалежнасьці ад Расеі.



Па ўтварэньні ўраду Луцкевіча (кастрычнік-лістапад 1918 г.) П.Крэчэўскі стаў Сакратаром Рады БНР, а Васіль Захарка – кіраўніком Сакратарыяту й міністрам фінансаў. У 1919 г. часова шляхі іх разышліся. Захарка знаходзіўся разам з Антонам Луцкевічам у Горадні, а пасьля ў Парыжы. Пётра Крэчэўскі ж на чале Надзвычайнага прадстаўніцтва БНР прыбыў у Коўна, каб весьці перамовы з прадстаўнікамі ўрада Літвы, падчас якіх дамагаўся афіцыйнага прызнання летувіскім урадам незалежнасці БНР у яе этнаграфічных межах.

Аднак, абодва неўзабаве сустрэліся ў Менску. Захарка, не падзяляючы палянафільскай пазіцыі Луцкевіча, стаў на сходзе Рады БНР, што адбыўся у Менску напрыканцы 1919 г., на бок бальшыні, якая ўхваліла вотум недаверу Луцкевічу. Тады ж старшынёй Рады БНР быў абраны Пётра Крэчэўскі, а яго намесьнікам стаўся Васіль Захарка.

Пасьля В. Захарка разам з П. Крэчэўскім з вялікімі цяжкасьцямі ўцяклі ад перасьледу польскіх уладаў пад чужымі імёнамі ў Нямеччыну (2 лютага 1920 г. апынуліся ў Бэрліне), а пазьней пераехалі у Прагу. Захарка з'явіўся ў Чэхіі першым і пасяліўся ў сьціплай хатцы ў ваколіцы Прагі.

У 1923 годзе ў Прагу пераехаў і П. Крэчэўскі.

Працаваць разам на карысьць роднай Беларусі заставалася ім пяць гадоў. Але зроблена было даволі многа: у 1924 г. Старшыня Рады БНР накіраваў два мемарандумы ў Лігу нацыяў, у якіх патрабаваў прызнаць незалежнасць Беларусі ў яе этнічных межах; у кастрычніку 1926 г. актыўна ўдзельнічаў у заснаванні ў Празе міжнароднага аб'яднання — Сацыялістычнай Лігі Новага Усходу Еўропы; падтрымліваў сувязі з беларускімі грамадскімі й культурнымі арганізацыямі ў Празе; дамогся ад ураду Чэхаславакіі аказання матэрыяльнай падтрымкі беларускім студэнтам. І, вядома, гэта далёка не поўны сьпіс…

П.Крэчэўскі памёр 8 сакавіка 1928 г., пакінуўшы нам у спадчыну яшчэ і свае гісторыка-літаратурныя творы: вершаваны драмы "Рагнеда" і "Здрада" (1923), вершы, зборнік па гісторыі, культуры і эканоміцы Беларусі "Замежная Беларусь» (выдадзены ў Празе ў 1926 г.), пераклады з чэскай і ўкраінскай моваў…

Новым старшынёй Рады Беларускай Народнай Рэспублікі стаў Васіль Іванавіч Захарка. Ён уяўляў сабой нібы скрыню запавету паміж старымі і новымі часамі, і пасьля сьмерці Крэчэўскага не толькі ахоўваў архівы, але й узьняў апушчаны іншымі штандар. Захарка ўсклаў на сябе ўсе іх абавязкі і стаўся сымбалем беларускай незалежнасьці. Ён шмат працаваў, змагаўся за незалежнасць Беларусі, пісаў розныя пратэсты, сустракаўся з прадстаўнікамі еўрапэйскіх дзяржаў. Афіцыйна ж ён узначаліў Беларускую Раду ў Празе, якая лічылася легальным працягам як першаснай Рады Зьезду, так і пазьнейшай Рады Беларускай Народнай Рэспублікі — Рады БНР. Такое становішча трывала 15 гадоў.

Яшчэ В.Захарка ў Чэхіі пісаў гісторыю Беларусі. Усё жыццё дзеля гэтага ён зьбіраў матэрыялы, і ўсім беларусам ён ахвотна чытаў урыўкі са свае працы, якую не спыняў да сьмерці…




6 сакавіка 1943 года Захарка ў лісьце N 546, адрасаваным Міколу Абрамчыку і Ларысе Геніюш, перадаў свае паўнамоцтвы старшыні Рады БНР Мікалаю Абрамчыку: "Будучы даўгі час цяжка хворым, што можа неўзабаве прывесьці хутчэй да благога, чымся добрага канца майго жыцьця, гэтым лістом я перадаю Вам, Спадар Інжынэр, пасаду Старшыні Рады БНР... Пад гэтым таксама маецца наўвеце, што ўсе архівы й дакумэнты пераходзяць таксама пад Вашую адказнасьць".

А праз тыдзень, 14 сакавіка 1943 году, яго не стала. Пахавалі Васіля Іванавіча Захарку побач з яго жонкаю і адначасова надзейным сябрам Пелагеяй Іванаўнай Захарка. Магіла была загадзя закуплена і разлічана на дваіх. Стаяў там і помнік з выяваю Пагоні. Пазьней на помнік толькі прымацавалі мармуровую шыльдачку з прозвішчам Васіля Захаркі. Смерць старшыні Рады БНР выклікала вялікі рэзананс у Эўропе. Але нямецкая цэнзура не дазваляла друкаваць у газетах артыкулы некралёгі, а таксама кантралявала, каб гэтая сумная вестка не дайшла да Беларусі.

Пасьля сьмерці Захаркі Мікола Абрамчык узяў пад сваю адказнасьць беларускія архівы ад Ларысы Геніюш і перавёз іх у Парыж. Так скончыўся "чэскі перыяд" у гісторыі Рады БНР дваццатага стагоддзя.

*З працы Васіля Захаркі «Галоўныя моманты беларускага руху» напісанай ў Празе ў 1926 годзе: «Урачыстае адчыненьне Ўсебеларускага Зьезду адбылося 14/27 сьнежня а 8 гадзіне вечара, пад старшынствам паважанага нацыянальнага дзеяча, сябра Беларускай Сацыялістычнай Грамады Язэпа Дылы…*
*Усяго на зьезьдзе было 1892 дэлегаты… Весткі аб гвалтоўным разгоне Зьезду страшэнна абурылі ўсё беларускае жыхарства супраць бальшавікоў. Яшчэ невядома ва што вылілася б нянавісьць беларускага народу, каб бальшавікі не ўцяклі зь Менску перад прыходам немцаў у лютым 1918 г. …Цяжкую атмасфэру магло разагнаць толькі паўстаньне супраць панявольнікаў. Беларускія сацыялістычныя й нацыянальныя арганізацыі, нягледзячы на адсутнасьць усякіх матэрыяльных сродкаў, пачалі гатавацца да яго»*

**Іна Паўловіч.**
***старшыня суполкі Скарына***

Фотаздымкі: Васіль Захарка, магіла Пятра Крэчэўскага на Альшанскіх Могілках у Празе.

# МЫ ЗРАБІЛІ ПАМЫЛКУ...

*Мечыслаў Грыб – чалавек, які асабіста падпісваў першую Канстытуцыю незалежнай Беларусі. Зараз колішні старшыня Вярхоўнага Савету 12 скліканьня працуе над кнігай пра падзеі ў беларускім парламенце ў 90-я гады і, у прыватнасьці, рэферэндум па зьмене Канстытцыі 1996-га год. Наша гутарка адбылася напярэдадні двух гістарычных для Беларусі датаў: угодкаў прыняцьця Канстытуцыі ў 1994 г. і абвяшчэньня БНР у 1918-м.*

**Мечыслаў Іванавіч, скажыце, калі ласка, на якой аснове фармаваўся Асноўны закон нашай краіны? Які вопыт пры гэтым вывучаўся і скарыстоўваўся?**

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь прымалася даволі доўга. Распрацоўку Канстытуцыі РБ мы пачалі ў 1990 годзе. Вярхоўны Савет 12-га скліканьня прыняў такое рашэньне. Для гэтага былі створаны дзьве групы распрацоўшчыкаў. Адна група – на чале з Васілём Іванавічам Шаладонавым, намесьнікам старшыні Вярхоўнага Савета таго часу (яна лічылася афіцыйнай). Другая група – на чале з былым дэпутатам Віктарам Іосіфавічам Ганчаром. Яна распрацоўвала альтэрнатыўны варыянт праекту Канстытуцыі. Прапрацаваўшы больш за год, групы зрабілі свае напрацоўкі і праекты новай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. На агульным паседжаньні было вырашана гэтыя два праеты аб'яднаць у адзін. І далей працавалі ўжо з адным праектам. Праца была доўгай і складанай. Вывучалі сусьветны вопыт, Канстытуцыі замежных краін -- Расіі, Украіны, Польшчы, Прыбалтыйскіх краінаў, Злучаных Штатаў Амерыкі і шэрагу іншых. І не толькі вывучалі тут, на месцы, але і выязджалі ў гэтыя краіны і знаёміліся з распрацоўкай іх Канстытуцыяў.

Канстытуцыя павінна была прымацца канстытуцыйнай большасьцю – гэта 2/3 дэпутатаў Вярхоўнага Савету. І прымаўся кожны артыкул Канстытуцыі. Здаралася так, што не толькі кожны артыкул паасобку – прымалася кожная частка артыкулу. У артыкуле магло быць і пяць, і шэсьць, і сем частак, і ўсе прымаліся канстытуцыйнай большасьцю. Потым ўжо артыкул прымаўся, потым глава, потым разьдзел, і толькі напрыканцы – уся Канстытуцыя. Патрабаваньні былі такія, каб не менш як 2/3 прагаласавала за кожнае палажэньне. Але яшчэ да прыняцьця Канстытуцы, калі мы склалі ўжо праект і маглі па ім працаваць, мы свае напрацоўкі накіроўвалі таксама ў замежныя краіны: у Германію, Украіну, ЗША… Мы атрымлівалі адтуль заўвагі, ацэнкі, заключэньні відных сьпецыялістаў гэтых краінаў. Мы друкавалі некалькі разоў праект Канстытуцыі ў газетах, зьвярталіся да нашых выбаршчыкаў, да нашых грамадзян. Атрымлівалі вельмі шмат заўваг, прапаноў – тысячы іх проста былі. Іх разглядалі ў камісіі, штосьці прымалі, ад нечага адмаўляліся… Так што гэтая праца была вельмі і вельмі складаная.

**Атрымліваецца, сам народ браў удзел у фармаваньні беларускай Канстытуцыі?**

Так, менавіта. Прапановы ішлі і пісьмовыя ў Вярхоўны Савет, і праз газеты, і праз тэлефонныя размовы. Фіксавалася усё, любая прапанова. Сярод іх былі і вельмі дарэчныя, слушныя, і непадрыхтаваныя, якія нельга было ўключыць у праект Канстытуцыі...

**Але потым Канстытуцыя нашай краіны была зьменена шляхам рэферэндумаў. На Вашу думку, наколькі поўна ў ёй цяпер акрэсьлены асноўныя правы і свабоды чалавека?**

Я лічу, што Канстытуцыя была зьменена адным рэфэрэндумам – у 1996 годзе, калі напрамую ўнесьлі новы праект Канстытуцыі – фактычна яна так называлася. Пытанне на рэферэндум, якое ўнёс непасрэдна сам Аляксандр Лукашэнка, гучала так: "Вы падтрымліваеце Канстытуцыю 1994 года з дабаўленнямі і зьмяненнямі, якія прапанаваў прэзыдэнт РБ?" І сам рэферэндум, і яго пытаньні – усё гэта было штучнае, і таму у СМІ з'явіўся шэраг тэз пра тое, што ў Беларусі ёсьць канстытуцыйны крызіс, які трэба вырашыць. На самай справе ніякага канстытуцыйнага крызісу не было. Гэта ўсё было проста надумана і падавалася людзям як нешта вельмі важнае. Ну які можа быць канстытуцыйны крызіс, калі ёсьць Канстытуцыя, якая падзяліла тры галіны ўлады – заканадаўчую, выканаўчую і судовую, -- кожную зь якіх надзяліла пэўнымі вялікімі паўнамоцтвамі, дала магчымасьць узаемаадносін паміж гэтымі галінамі ўлады і прадугледзела магчымасьць узаемаўтрыманьня адной галіны ўлады другой? Усё было вырашана Канстытуцыяй. Але калі Лукашэнка хацеў падпарадкаваць сабе гэтыя галіны ўлады і пайшоў на гэта – то, прабачце, гэта больш можна назваць дзяржаўным пераваротам, а не канстытуцыйным крызісам. Калі адна ўлада хоча падмяць пад сябе іншыя шляхам зьмяненьня Канстытуцыі.

**Бываюць перавароты, а бываюць народныя рэвалюцыі, прыклад апошняй мы пабачылі ва Ўкраіне. Наколькі Канстытуцыя акрэсьлівае права народа на пратэст?**

Канстытуцыя 94-га году давала людзям права на пратэст. Канстытуцыя 96-га, з усімі зьмяненьнямі, дапаўненьнямі, таксама такое права не забараняе. Але справа ў іншым. Калі Лукашэнка прыйшоў да ўлады, ён з самага пачатку імкнуўся дамагчыся права прымаць заканадаўчыя акты. На падставе гэтага і было непаразуменьне з Вярхоўным Саветам – спачатку 12-га, а потым і 13-га скліканьня. Яшчэ ў першы год свайго кіраваньня ёе пачаў прымаць указы (дэкрэтаў тады яшчэ не было), якія адмянялі многія заканадаўчыя акты і супярэчылі Канстытуцыі. Напрыклад, 1 верасьня 1995 г. ён апублікаваў два ўказы за нумарамі 349 і 350: ён адмяняў цэлы шэраг прывілеяў для пенсіянераў, ветэранаў, ён адмяніў дэпутацкі імунітэт. Адным толькі ўказам адмяніў нормы 18-ці законаў! Ён ня меў на гэта ніякага права. А потым былі зьмены ў Канстытуцыю… Калі на паседжаньні ВС 13-га скліканьня прэзідэнта спыталі, хто аўтар новай Канстытуцыі, ён адказаў: "Аўтар стаіць перад вамі". Ён назваўся аўтарам гэтай Канстытуцыі! Сам распрацаваў, сам дамогся прыняцьця, законна ці незаконна – гэта ўжо іншая справа. Але зараз і яна ж не выконваецца! Канстытуцыя – сама па сабе, справы – самі па сабе, дэкрэты – самі па сабе, указы – таксама… Справа не ў Канстытуцыі, па якой мы жывем дэ-факта, а ў тым, што кіраўнікі краіны не жадаюць яе выконваць.

Тое самае і з правамі чалавека. Я лічу, што правы чалавека ў нашай Канстытуцыі 1994 году былі закладзены даволі поўна, пра гэта ёсьць заключэньні вядомых спецыялістаў па абароне правоў чалавека ў розных краінах сьвету. З унясеньнем зьмен і дапаўненьняў у Канстытуцыю яны таксама там у асноўным сваім сэнсе засталіся. Таму што накіраванасьць гэтых зьмен была не на правы чалавека, а на перадзел улады. Яна тычылася правоў парламента і прэзідэнта, судовай улады, а не непасрэдна правоў чалавека-грамадзяніна. Хоць і судзьдзя, і дэпутат – таксама людзі, якія маюць свае правы. У гэтым сэнсе іх правы значна абмежаваны. Гэтак было пры савецкай уладзе. Канстытуцыі тады таксама былі даволі дэмакратычныя, а жыцьцё ішло сваім шляхам. Напрыклад, кожны чалавек меў права абраць сабе на жыхарства любы куток Савецкага Саюзу. А насамрэч недзе да 60-х гадоў усё сельскае насельніцтва не мела пашпартоў, а без пашпарту немагчыма было нікуды з'ехаць, працаўладкавацца… Каб атрымаць пашпарт, чалавек павінен быў сабраць шмат даведак, але нават не ў тым справа. Галоўнае было – каб яго адпусьціў старшыня калгаса па месцы жыхарства. І калі ён цябе не адпусьціць, ты нікуды не паедзеш і нідзе не будзеш працаваць, акрамя гэтага калгаса. У Канстытуцыі ж усё гэта не запісана! А ў жыцьці гэта ёсьць.

Парушаліся і іншыя правы. Напрыклад, кожны чалавек незалежна ні ад чаго меў права працаўладкоўвацца. Але пасьля вайны (Другой Сусьветнай – Т.С.) існавалі такія падыходы. У анкеце, якую ты запаўняў, уладкоўваючыся на працу, была такая графа: "Дзе ты знаходзіўся у час Вялікай Айчыннай вайны? Ці быў ты на акупаванай тэрыторыі?" Калі ты быў на акупаванай тэрыторыі, да цябе адзін падыход. Калі не быў – значыць, іншы падыход. Як быццам бы ў гэтым была твая віна. Хаця цябе ні ў чым не вінавацяць, ты нічога процізаконнага не зрабіў, але ты быў там, і ў гэтым твая віна… У Канстытуцыі ж усё гэта не прадугледжана, і няма нічога такога ў Канстытуцыі, і не было, а жыцьцё вось так ідзе! Што ж датычыць права на свабоду… У Канстытуцыі напісана адно, але папрымалі шэраг іншых законаў, якія кожны трактуе як хоча. Па Канстытуцыі можна і выступаць, і пратэставаць, і мець сваё меркаваньне, а ў жыцьці часта гэтага няма – асабліва што тычыцца палітыкі. Вось і ўчора Лукашэнка паехаў на рынак, сустракаўся там з прадпрымальнікамі (якія праводзілі акцыі пратэсту – Т.С.). І сказаў ім, што гэта добра, што яны, калі пратэставалі, не далучыліся да палітыкаў. Інакш, маўляў, вам было б вельмі дрэнна. А калі толькі эканамічныя пытаньні – ладна, Бог з вамі, гэта можна. Палітычныя пытаньні, значыць, уздымаць нельга. У Канстытуцыі ж гэта не падзелена... Палітычныя, эканамічныя правы – гэта ўсё адзіна…

**Ці існуе зараз пагроза незалежнасьці Беларусі, анэксіі яе Расіяй?**

Я мяркую, што слова "незалежнасьць" трэба ўжываць у адносінах да краіны ўзважана. Чыстай незалежнасьці любой краіны сёньня ў сьвеце няма. Усе дзяржавы сёньня ў меншай ці большай ступені залежаць адна ад другой. Нават такая супердзяржава, як Злучаныя Штаты Амерыкі, таксама залежыць ад шэрагу іных краін. Можа, менш, чым Беларусь альбо Расія, але таксама залежыць. Незалежнасьць трэба трактаваць як права на вызначэньне сваёй зьнешняй і унутранай палітыкі, права праводзіць сваю эканамічную палітыку ў той ці іншай краіне. Гэта ўсё адносна. Раней мы так цесна падышлі да нейкага паразуменьня з Расійскай Федэрацыяй, што вось-вось маглі аб'яднацца ў адну дзяржаву. Наш народ ставіўся да гэтага больш-менш спакойна. Памяталі яшчэ Савецкі Саюз, і там таксама былі нейкія накірункі, прывабныя для людзей. Але справа была зусім не ў людзях, а ў кіраўніках. Калі нашаму кіраўніку дзяржавы нешта спрыяла ў цесных стасунках з Расіяй (мяркую, ён меў нядрэнныя дывідэнды, эканамічныя і палітычныя, адной нагой стаяў у Крамлі, як ён сам сябе адчуваў), аб'яднаньне для яго было выгадна, і ён выступаў за гэта. Калі ўлада ў Расіі зьмянілася і новыя людзі зразумелі, што да чаго, яму адмовілі ў яго намерах… Думаю, што сёньня гаварыць пра аб'яднаньне – пустая справа. Нічога ў нас для гэтага няма і ў бліжэйшы час, мне здаецца, і не будзе. Зразумела, што мы залежым ад Расіі, гэта наш сусед, зь якім трэба сябраваць, гандляваць – магчыма, на двухаковых пагадненьнях, -- але гэта не значыць, што мы павінны аб'ядноўваца ў адну дзяржаву. Сёньня, мне здаецца, гэта ўвогуле нявыгадна, у першую чаргу кіраўніку нашай дзяржавы: яму там сёньня нічога добрага не сьвеціць.

*працяг на старонцы 4*

# ВІНШУЕМ
## КАТАЛІКОЎ І ПРАТЭСТАНТАЎ СА СЬВЯТАМ ВЯЛІКАДНЯ

Слова, якое нагадае нам напярэдадні Вялікадня пра Божую правіцу ў Хрысьце, працягнутую чалавеку, запісана ў Першым пасланьні Пётры 1:18-21:

*"...ня трухлеючым серабром ці золатам адкуплены вы ад марнага жыцьця, перазанага вам ад прабацькоў, 19. але найкаштоўнейшай крывёю Хрыста, як чыстага ягняці бяз сказы, 20. наканаванага яшчэ да стварэньня сьвету, але зьявіўшагася ў апошнія часы дзеля вас, 21. паверыўшых праз Яго ў Бога, які ўскрасіў Яго з мёртвых і даў Яму славу, каб вера вашая і надзея былі на Бога."*

Слова адкупленьне, якое Пётра ўжывае да місіі Хрыста мы можам часта пачуць у нашым сёньняшнім жыцьці. Калі нейкага пікетчыка схопіць АМАП, ён вымушаны плаціць адкупныя ў выглядзе штрафу. Гэта своеасаблівы выкуп, пра які кажуць: яшчэ малым коштам адкупіўся. Час ад часу ў навінах чуем, што ў тым ці іншым кутку плянэты тэрарысты захапілі закладніка і патрабуюць адкупныя. З гісторыі ведаем, што калі нехта неплаціў запазыку, яго пазбаўлялі свабоды, пакуль сябры або сваякі невыкуплялі даўжніка.

Гэтымі некалькімі экскурсамі хачу зьвярнуць увагу, што ў слове адкупленьне моцна гучыць матыў вызваленьня. У тэксце, які ўзяты за заклад гэтай развагі, гаворыцца пра тое, што выкуп быў заплачаны не звычайнымі сродкамі, якія можа сабе дазволіць чалавек. Гаворыцца пра адкупленьне крывёю Хрыста, якога апостал невыпадкова параўноўвае з пасхальным ягняткам. Калісьці старажытнаму ізраэльскаму народу адкрыўся шлях да свабоды з эгіпецкага рабства абрадавай ахвярай і праліцьцём крыві беззаганнага ягняці, таму і тут зразумелым тагачаснаму чалавеку найвялікшым ахвяраваньнем Ягняці-Ісуса, Бог адчыняе людзям шлях да новага свабоднага існаваньня. Сымбалічнае значэньне мае і кроў Хрыстова. Кроў раней успрымалася людзьмі, як элемэнт, які нясе жыцьцё целу, у ёй быў дух. Як праз кроў нашых зямных бацькоў мы ўваходзім у гэтае жыцьцё, так і Хрыстова кроў духоўна нараджае хрыстовых дзяцей, якія ўваходзяць зь Ім у іншае жыцьцё. Той, хто Хрыстовы, мае заруку, што возьме ўдзел у тым новым жыцьці, да якога належыць Хрыстос і якое апосталы называюць вечным. Як нашыя бацькі даюць нам права на спадчыну, так і Хрыстос уводзіць сваіх дзяцей ў сваю спадчыну.

Як высьвятляе нам Эвангельля, Хрыстос вызваляе ад адчужанасьці Богу, ад граху, які пануе над намі і якому мы служым. Адчужанасьць Богу практычна выяўляецца ва ўсіх сфэрах жыцьця. Чын жыцьця чалавека і ўзаемаадносіны паміж людзьмі сьведчаць пра тое - або прымірыліся мы з Богам у Хрысьце або не.

Большасьць бацькоў трымаюць да сваіх дзяцей такі вялікі крэдыт любові, што мы нават яшчэ ненарадзіўшыся проста наканаваныя быць у іхнай ласцы. Нягледзячы на ўсе нашыя хібы, якія мы абавязкова ўчынім, бацькі ўсёадно будуць нас любіць. Таму, кажучы аб "наканаванасьці ягняці да стварэньня сьвету", апостал падкрэсьлівае вялікую ласку Бога да сваіх дзетак, якія яшчэ ненарадзіліся. І, якія напэўна сьхібяць ў сваім жыцьці, як гэта здарылася з блудным сынам, што змарнаваў бацькаву спадчыну. Адчужанасьць, што ўзьнікае паміж людзьмі і Богам-Айцом пераадольваецца адкупленьнем, якое Ён меў у сваім сэрцы яшчэ да стварэньня ўсяго Ім створанага.

Адзін са спосабаў пазнаньня сьвету - пазнаньне яго верай Хрыстовай. Калі апостал кажа пра Ўваскрэсеньне Хрыста, то не кажа пра гэты факт, як пра нейкі містычны цуд. Сталася рэч дагэтуль прыхаваная - тое, што недзе глыбінна існуе, хаця мы гэта і не бачым. Захоўваючы, камусьці са сваіх блізкіх на нараджэньне падарунак мы выцягнем яго толькі тым сьвяточным днём, дзеля якога ён быў прызначаны. Так і з Уваскрэсеньнем Хрыстовым. Наканаваны Айцом падарунак быў пакладзены на сьвяточны стол тады, калі сьвет знаходзіўся ў роспачы, прарокі маўчалі і сьвята ўжо аніхто не чакаў. Дзень Уваскрэсеньня нам выяўляе і праўдзівы сэнс чалавечага жыцьця – зь мёртвых паўстаньне. Кульмінацыйная падзея Хрыстовага жыцьця - зь мёртвых паўстаньне, напоўнілася тым, што Ён увайшоў у Славу Бога. Наша сытуацыя вымагае ад нас шчырае веры, надзеі і любові, бо хочам жыць у вечнасьці і свабодзе. Як сказана у нашым старым крэдо: Веру ў Духа Сьвятога, Сьвятую царкву паўсюдную, супольнасьць сьвятых, дараваньне грахоў, зь мёртвых паўстаньне і жыцьцё вечнае.

Мы ня можам жыць без надзеі. Здараюцца выпадкі, калі ў жыцьці мы губляем надзею на справядлівае вырашэньне сытуацыі. Так сталася і з вучнямі Хрыста, якія разьбегліся і страцілі надзею, калі Яго схапілі. Зьвесьць пра Ўваскрэсеньне Хрыста мае пражыць у Духу кожны чалавек асобна, тады надзея яго не пакіне.

Вядомы раман А. Дюма "Граф Монтэ Крыста" падае неверагодны прыклад надзеі галоўнага героя. Эдмон Дантэс, стаўшы ахвярай чалавевечай здрадліваcьці, згубіў усё, нават і свабоду. Чалавек, якому было наканавана скончыць сваё жыцьцё ў жахлівай вязьніцы, не губляў надзеі. Падобны выпадак нам падае і Біблія (Быцьцё, кап.37). Калі ўспомніце Язэпа, якога падступна прадалі ў рабства ўласныя браты, то напэўна пагодзіцеся са мной, што была падстава страціць надзею на людскую справядлівасьць. Але вера і спадзяваньне на Божую справядлівасьць уратавала гэтых людзей.

Сьвята Вялікадня, зноў і зноў нагадвае і будзіць нашу надзею на тое, што апошняе слова справядлівасьці і моц належаць СПАДАРУ. З Хрыстовым Уваскрэсеньнем у нашых душах уваскрасае надзея пачатку новага жыцьця ў славе Божай.

**Амэн.**

***Магістр тэялёгіі Сьвятаслаў Лiпень***

# МЫ ЗРАБІЛІ ПАМЫЛКУ...

*працяг са старонкі 3*

**Як Вы ставіцеся да БНР?**

Стаўленьне да БНР у мяне асабістае. Таму што пэўны час я выхоўваўся на тых пастулатах, што гэта было нерэальна, што гэта была не дзяржава і г.д. Я многага не ведаў, усё прыходзіць з жыцьцём. Зараз маё стаўленьне да БНР станоўчае. Я лічу, што людзі зрабілі вялікую справу. І, мабыць, мы зрабілі памылку ў свой час, што дзень утварэньня БНР, 25 сакавіка, не прызналі за сьвята рэспублікі, а прызналі дзень гэтай дэкларацыі... Так здаецца на сёньняшні розум больш правільным. А тое, што гавораць, што БНР была абвешчана, калі на тэрыторыі рэспублікі знаходзіліся нямецкія войскі... Гэта так, але ж і БССР была ўстаноўлена, калі на тэрыторыі Беларусі знаходзіліся расійскія войскі! Адных мы лічым, што яны былі такімі, а другіх – што былі іншымі. Адны былі акупанты, а другія – як быццам былі сябры... На вялікі жаль, кожны трактуе сёньняшнюю гісторыю, і нават учарашнюю, так, як бліжэй яго разуменьню, як яму выгадна. Але ж гісторыя ёсьць гісторыя: як яе ні стаў, яна ўсё роўна будзе гісторыяй. Незалежна ад таго, як ты хочаш яе пачуць.

> ***Даведка:*** *Пад час канстытуцыйнай дыктатуры гэнэрала Грыба, за удзел у Першым Зьезьдзе Беларускіх Нацыяналістаў у Вітэбску, Алесь Пушкін адсядзеў 15 сутак, Андрэй Рамашэўскі - 10, а Славамір Адамовіч - 3. Сядзелі і іншыя.*

***Гутарыла Тацяна Сьнітко***

# СУПОЛКА «СКАРЫНА» Ў ІНТЭРНЭЦЕ

Нягледзячы на перашкоды спадара Яндзюка, які заблякаваў працу дамэну **www.skaryna.cz**, што належыць суполцы «Скарына», але адмініструецца Яндзюком, (пакінуў суполку) нашая суполка й далей жыве у глябальным сэціве, але на іншых адрэсах. Афіцыйны сайт суполкі знойдзеце на **http://www.skaryna.net/**, а на адрэсе **http://forum.skaryna.net/** працуе форум адчынены для дыскусіі паміж сябрамі суполкі ды й з іншымі беларусамі. Сябры суполкі вольна карыстаюцца мэйлавымі адрэсамі ў дамэне **skaryna.net**

***Андрэй Рамашэўскі,***
***сябра Рады суполкі «Скарына»***

ВЫДРА БЕЛАРУСКАЯ - Выданьне Рады Беларускай суполкі ў Чэхіі «Скарына». N2, сакавік 2005. E-mail: vydra@skaryna.net
Рэдакцыйная калегія: Рыгор Жыдкоў, Генадзь Кажамяка, Іна Паўловіч, Андрэй Рамашэўскі (рэдактар), Арсеній Скарулiс, Сяргей Скарулiс, Юрка Станкевіч.
© 2005 Суполка «Скарына». Усе правы абаронены. Перадрукоўка цэлых тэкстаў альбо частках с абавязковай спасылкай на першакрыніцу дазволена.
Пры падрыхтоўцы выданьня была выкарыстана вольнае праграмовае забясьпячэньне - vim, gimp, inskape, scribus пад апэрацыйнай сістэмай Debian Linux